# Эканамічная гісторыя Барысаўскага рэгёна і горада Барысава

## *(з найстаражытных часоў да сучаснасці)*

***(Працяг, пачатак у №10-12 (175-177) за 2013 г., 1-12(178-189) за 2014 г. і 1-12(191-201) за 2015 г., 1-9(202-211) за 2016 г., 1-2(214-215), 4-12(217-225) за 2017 г., 1-11(226-236) за 2018 г., 1-2(238-239), 4-8(241-245), 10-12(247-249) за 2019 г., 1-2(250-251), 4-12(253-261) за 2020 г., 1(262), 3(264), 6-8(2678-269) за 2021 г.)***

Адной з найбольш важных задач, якая стаяла перад пралетарскай дзяржавай у 1920-я гады было змаганне з беспрацоўем. Нягледзячы на меры, якія прадпрымаліся, ліквідаваць гэтую негатыўную з'яву з жыцця савецкага грамадства доўгі час не атрымлівалася. Больш таго, у перыяд НЭПа беспрацоўе з года ў год прагрэсіравала. Сярод асноўных фактараў росту – перыядычнае скарачэнне кіраўнічага апарата, меры па паніжэнні вытворчых выдаткаў прадпрыемстваў, нежаданне кіраўнікоў заводаў і фабрыкаў браць людзей без кваліфікацыі, узмацненне падатковага ціску на прыватны капітал, аграрнае перанасяленне ў вёсцы, масавае скарачэнне (дэмабілізацыя) РККА.

На канец лютага 1925 г. у Менску, Магілёве, Віцебску, Бабруйску, Барысаве, Слуцку, Клімавічах, Мазыры, Оршы і Полацку налічвалася 17 тыс. 23 беспрацоўных (11 тыс. 901 мужчына і 5 тыс. 122 жанчыны). Па колькасці гэта амаль супастаўіма з насельніцтвам таго ж Барысава, дзе ў снежні 1925 г. пражывала 18 тыс. 225 чалавек. У Барысаве таксама назіралася павелічэнне людзей, якія не мелі сталай працы. Да прыкладу, калі ў пачатку лютага 1925 г. на Барысаўскай біржы працы было афіцыйна зарэгістравана 872 чалавекі, то да канца месяца – 881 (667 мужчын і 214 жанчын). У асобны артыкул уносіліся беспрацоўныя, члены прафсаюзаў (тэкстыльшчыкі, харчавікі, гарбары, металісты, дрэваапрацоўшчыкі, хімікі, друкары, будаўнікі і інш.). Такіх налічалася 485 чалавек. Заўважым, што пры двух роўных кандыдатах перавага на працаўладкаванне аддавалася члену прафсаюза. Да ведама, працаўладкаваннем членаў ВКП(б) займаліся мясцовыя партыйныя органы.

У статыстыку ўносіліся беспрацоўныя грамадзяне, якія былі зарэгістраваны на біржы працы, – афіцыйнага пасярэдніка на рынку наймання працоўнай сілы. У публікацыях пра Барысаў тых часоў сустракаецца назва "Пасрэдбюро" (пасрэдніцкае бюро). Між тым біржы былі шматфункцыянальнымі тэрытарыяльнымі ўстановамі, якія сумесна з прафсаюзамі і гаспадарчымі органамі вырашалі праблемы прадстаўлення працоўных месцаў бедным і сацыяльных гарантый беспрацоўным, забеспячэння прадпрыемстваў працоўнай сілай. Біржы працы вывучалі рынак працы ў сацыяльным, прафесійным, дэмаграфічным і тэрытарыяльна-галіновым разрэзах, вялі статыстыку працы і беспрацоўя ў рэгёнах. Пасрэдніцтва біржаў распаўсюджвалася як на тых, хто шукае працу працы, так і на наймальнікаў, якія нярэдка падбіралі патрэбныя ім кадры самастойна. Абгаварыўшы ўмовы працы, тыя, хто шукаў працу, прыходзілі на біржу толькі для рэгістрацыі і атрымання фармальнага накірунку. Звалася гэта "імянным попытам" або "імянным патрабаваннем". Біржы і аддзелы працы спрабавалі змагацца з самастойным найманнем, якое падрывала іх манаполію.

Тым не менш па пратэкцыі, знаёмстве або за хабар можна было атрымаць выгоднае накіраванне, зарэгістравацца для налічэння грашовай дапамогі, здабыць палёгкі і г.д. Друкаваны орган Барысаўшчыны газета "Вясковая праўда" ў нумары за 7 лютага 1926 г. пісала: "Пасрэдбюро дагэтуль не зжыта накіраванне на працу па імянных патрабаваннях не толькі асоб кваліфікаванай працы, але нават чорнай працы. Пры такім парадку тыя, хто меў "знаёмствы", уладкоўваюцца на працу хутчэй, чым тыя, хто сапраўды жыве ў нястачы". З мэтай памяншэння ліку "прафесійных" беспрацоўных і выяўлення асоб, якія не мелі права быць на ўліку, біржы перыядычна падвяргаліся так званым "чысткам". Рэспубліканская газета "Звязда" (№ 46 за 25 лютага 1923 г.) у матэрыяле пра дзейнасць прафсаюзаў Барысава і Новабарысава паведамляла: "Пасля дбайнай чысткі біржы засталося на ўліку 574 чал., з іх мужчын 363 і 211 жанчын. Дапамога размяркоўваецца па дзвюх катэгорыях. Першая катэгорыя атрымала 40 р., другая 25 р. Пры біржы маюцца прадстаўнікі ўсіх саюзаў. Сацстрахаванне атрымалася наладзіць, дзякуючы энергічнаму садзейнічанню прафсаюзаў".

Да зыходу НЭПа ўзровень незанятых у эканоміцы барысаўцаў у параўнанні з іншымі гарадамі некалькі панізіўся. Уплыў аказвала развіццё прамысловасці і шырокамаштабныя будаўнічааднаўленчыя працы, якія разгарнуліся (асабліва ў правабярэжнай, новай частцы) у рамках рэспубліканскай праграмы па ўзнаўленні Барысава. Паміж тым да канца студзеня 1927 г. у статусе беспрацоўнага знаходзілася 1 тыс. 251 чалавек (670 мужчын і 581 жанчына). У тым жа Бабруйску такіх налічалася 1 тыс. 780 чалавек.

Парадокс заключаўся ў тым, што пры павелічэнні беспрацоўных прамысловасць мела дэфіцыт кваліфікаваных працоўных розных спецыяльнасцяў, асабліва востра стаяла праблема ў вузкіх спецыялістах. Так, у лютым 1925 г. Барысаўская біржа працы, маючы 277 заявак ад працадаўцаў, дала накіраванні на новае месца працы толькі 62-м грамадзянам. У сярэдзіне 1920-х фабрычна-завадскія беспрацоўныя складалі 31,1%, іншых сфер эканомікі – 12,3%, працаўнікі разумовай працы – 25,2%, чорнарабочыя – 31,4%. Як відаць, найболей шматлікай групай былі людзі без спецыяльнасці, якіх да канца лютага 1925 г. на біржах было 4 тыс. 688 чалавек (3 тыс. 536 мужчын і 1 тыс. 152 жанчыны).

Асноўнай формай змагання з беспрацоўем лічыліся грамадскія працы. Па дадзеных на 1925 г. у такіх працах па рэспубліцы было задзейнічана 10 тыс. 800 чалавек. Асноўнымі спажыўцамі працоўных рук была камунальная гаспадарка і сфера транспарту. Барысаўская біржа працы штодня задавальняла заяўкі ад камунальнікаў і транспартнікаў, часова працаўладкоўваючы дзясяткі беспрацоўных.

Навіной у змаганні з беспрацоўем было развіццё працоўных калектываў (сканцэнтраванне кваліфікаваных і не вельмі кваліфікаваных працаўнікоў) у дробнай вытворчасці, тыпу саматужна-прамысловых саюзаў. У працоўных калектывах вялася не толькі вытворчасць тавараў і аказанне паслуг, але і падвышэнне кваліфікацыі працаўнікоў, уключаючы самую неабароненую катэгорыю – жанчын і падлеткаў. Працоўныя калектывы атрымлівалі палёгкі ў падаткаабкладанні, фінансавую дапамогу ад біржаў працы і фондаў дапамогі беспрацоўным, што спрыяла як іх скарачэнню, так і ўзнаўленню народнай гаспадаркі. У 1927 г. вытворча-працоўныя саюзы Барысава і Новабарысава былі аб'яднаны ў працоўныя калектывы пры Барысаўскай інспекцыі працы.

Таксама стваралiся вучэбныя курсы, дзе можна было беспрацоўным грамадзянам падвысіць кваліфікацыю, набыць сумежную спецыяльнасць або асвоіць прафесію, запатрабаваную на рынку працы.

Гэтыя і іншыя меры дазвалялі паменшыць тэмпы росту беспрацоўя, якая, акрамя эканомікі, негатыўна адбіваліся на настроі грамадства ў цэлым. Па-першае, рызыка пазбавіцца працоўнага месца пераважала над усімі працаўнікамі. Па-другое, трывогу ва ўладаў выклікалі выпадкі незадаволенасці дзяржаўнай палітыкай сярод беспрацоўных, іх дэпрэсіўны стан і амаральныя паводзіны, выкарыстанне любых шляхоў, у тым ліку супрацьпраўных, здабыць хлеб надзённы. Не дзіўна, што беспрацоўныя нярэдка папаўнялі статыстыку крымінальных злачынстваў.

***(Працяг будзе)***

***Аляксандр Балябін,***
*гісторык-археограф ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева"*